***Маўленчая размінка.*** Прачытайце радкі з верша Івана Калесніка «Бацькоўская хата». Правільна вымаўляйце гукі [ц’], [дз’], [р], [ў] і спалучэнне [цц].

Як соладка спі**цца**
У матчынай ха**це**.
Тут месяц гля**дзіцца**,
Тут зоркі **раяцца**.

Тут — шляху пачатак
І сілы к**р**ыніца.
Бацькоўская хата —
**Радзімы** зямліца…

**Во́дар** — прыемны пах.
**Медуні́ца** — травяністая расліна з дробнымі пахучымі кветкамі.
**Кру́ча** — абрыў, круты спуск.
**Спакваля́** — паволі, спакойна, не спяшаючыся.

## Бацькоўскі парог

*Анатоль Грачанікаў*



Чакае нас
Мноства дарог.
Нас вабяць
І далі, і высі.
Але на бацькоўскі
Парог
Абавязкова
Вярніся.

Каб сэрцам
Глыбока адчуць,
Як водар
Нясуць медуніцы,



Правообладатель Академия образования



Як сосны
Над кручай гудуць,
Як звоняць
Світальна крыніцы.
Асядзе
Туман спакваля
Крыштальнаю
Чыстай расою.
І дыхае ціха зямля.
Заўсёды
Ёй быць маладою!

Усё,
Што народ наш
Стварыў,
Аберагаць мы
Павінны.
І песню ўраджайную
Ніў,
І мірнае неба
Айчыны.

Чакае нас
Мноства дарог.
Нас вабяць
І далі, і высі.
Але
На бацькоўскі
Парог
Абавязкова
Вярніся.

?

1. Пра які бацькоўскі парог ідзе гаворка ў вершы?
2. З якім пачуццём піша паэт пра родны дом і малую радзіму?
3. Чаму аўтар запрашае нас абавязкова вяртацца на бацькоўскі парог? Якімі словамі ён сказаў пра гэта? Як гэта характарызуе самога паэта?
4. Якія словы дапамагаюць Анатолю Грачанікаву «ажывіць» родны кут, надаць яму чалавечыя якасці? Прачытайце.
5. Што ўслаўляе паэт у вершы?
6. Што робяць людзі ў нашай краіне для таго, каб зберагчы «Усё, што народ наш стварыў… і песню ўраджайную ніў, і мірнае неба Айчыны»?
7. Якім настроем прасякнуты твор? Прачытайце верш так, каб слухачам перадаўся адпаведны настрой.

## ПРАВЕРЦЕ СЯБЕ

***Ведаем…***

**1.** Назавіце аўтара кожнага з пералічаных твораў.

| Назва твора | Аўтар |
|---|---|
| а) «Адкуль пайшоў твой род?»<br>б) «Я — беларус»<br>в) «Вавёрка піша сачыненне»<br>г) «Бацькоўскі парог» | 1) Ніл Гілевіч<br>2) Барыс Сачанка<br>3) Алесь Карлюкевіч<br>4) Анатоль Грачанікаў |

**2.** Назавіце твор, з якога ўзяты наступныя радкі:

а) «Потым размножыліся і палешукі, і палевікі, занялі пусты лес дый пачалі жыць адны каля другіх побач»;



Правообладатель Академия образования

б) «Што значым усе мы ў гэтым няспынным і вечным кругавароце? У чым сэнс чалавечага жыцця? У каго спытаць? А можа... і не пытаць ні ў кога ні пра што...»;

в) Чакае нас
Мноства дарог.
Нас вабяць
І далі, і высі.
Але
На бацькоўскі
Парог
Абавязкова
Вярніся;

г) Я — беларус, і хоць сягоння
Яшчэ малы, але скажу:
Я родам з племя непакорных
І прад бядой не задрыжу!..

**3.** Устанавіце адпаведнасць паміж назвай твора і яго жанрам:

| | |
|---|---|
| а) «Адкуль пайшоў твой род?» | 1) казка |
| б) «Вавёрка піша сачыненне» | 2) верш |
| в) «Палешукі і палевікі» | 3) апавяданне |
| г) «Я — беларус» | 4) легенда |

**4.** Вызначце, хто і ў якім творы так расказвае пра сябе ці сваю сям'ю:

а) «Раніцай вылажу са свайго дупла, размінаю лапкі, абмахваюся хвосцікам. Калі нікога паблізу няма, бягу на самую вяршаліну сасны. Там, у закінутым дупле, ляжаць нанізаныя на галінку сушаныя баравічкі. Матуля забараніла

чапаць іх, гаворыць, што гэта — запас на зіму. А я ж толькі кавалачак адгрызу... Якое смакоцце!»;

б) «Вось і кажа большы брат:

— Застану́ся я тут, не магу выбрацца з лесу.

І застаўся ён сярод таго лесу. І назвалі яго і дзяцей яго палешукамі»;

в) «А ў бары, які здаўна завуць Блужскім, мы жывём шмат стагоддзяў. Рака, што нясе свае воды праз лес, завецца Свіслаччу. З левага берага раку ахінае вялікі дубовы гай. Разам з бацька́мі я ўжо лётаў туды. Мы з татам выдзеўблі некалькі дуплаў у адным са старых дубоў і нанасілі туды жалудоў. Зімой яны нам спатрэбяцца».

**5.** У якіх творах гэтага раздзела:

а) расказваецца пра казачных вучняў вавёрку Аленку і дзятла Петрака;

б) расказваецца народная легенда пра паходжанне палешукоў і палевікоў;

в) аўтар разважае, што такое жыццё і дзеля чаго яно даецца чалавеку;

г) пісьменнік раіць чытачу захоўваць сувязь з родным домам, малой радзімай?

**6.** У якой паслядоўнасці патрэбна пераставіць пункты плана, каб ён адлюстроўваў змест народнай легенды «Палешукі і палевікі»?

П л а н

1) «Было ў бацькі дванаццаць сыноў».

2) «... дый пачалі жыць адны каля другіх побач».



Правообладатель Академия образования

3) «Толькі два малодшыя браты жылі паміж сабою вельмі дружна».

4) «І застаўся ён сярод таго лесу».

5) «Пачалі браты дзяліцца».

6) «...давай яны з братам лавіць на рацэ дзерава, звязваць яго разам і рабіць плыт».

7) «...яны спыніліся там і сталі разрабляць поле».

8) «Толькі вось памёр стары́ бацька».

9) «...зрабілі яны колы».

***Разважаем...***

**1.** Чаму кожная сям’я павінна весці свой сямейны радавод і перадаваць яго звесткі наступным пакаленням?

**2.** Хто з нашых продкаў стаў ці можа стаць для вас прыкладам у жыцці?

**3.** Якіх вядомых землякоў вы ведаеце? Раскажыце, чым яны знакаміты. Складзіце вуснае апавяданне пра аднаго з вашых землякоў.

**4.** Якія жыццёвыя ўрокі вы атрымалі пасля вывучэння твораў гэтага раздзела?

**5.** У артыкуле 54 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь напісана: «Кожны абавязаны берагчы гісторыка-культурную, духоўную спадчыну і іншыя нацыянальныя каштоўнасці». Падумайце, якім чынам вы можаце дапамагчы дарослым выконваць гэты абавязак ужо зараз.

